«Вясна» — «экстрэмісцкае фармаванне». Што трэба ведаць?

Падтрымай “Вясну”

# У Швейцарыі будзе разгледжана апеляцыя на апраўдальны прысуд сахраўцу Юрыю Гараўскаму

11.06.2026 **Тэмы**: суды, крымінальны пераслед, зніклыя, FIDH

**Апеляцыйны суд над Юрыем Гараўскім, былым супрацоўнікам САХРа, спецпадраздзялення ўнутраных войскаў МУС пры Аляксандры Лукашэнку, адбудзецца 24 чэрвеня 2026 года ў Санкт-Галене, Швейцарыя. Гараўскі абвінавачваецца ў датычнасці да гвалтоўных знікненняў трох апазіцыйных палітыкаў у Беларусі ў 1999 годзе, у чым ён сам прызнаўся. Больш падрабязна пра гэта ў спецыяльным раздзеле.**




*Юрый Гараўскі. Ён сцвярджае, што забіваў апазіцыянераў на загад зверху. Фота DW*

Юрый Гараўскі быў апраўданы ў судзе першай інстанцыі ў верасні 2023

года пасля таго, як суд устанавіў, што наяўныя ў яго распараджэнні доказы не дазваляюць вызначыць асабісты ўдзел Гараўскага ў злачынствах па-за разумнымі сумневамі. У ходзе апеляцыйнага разбору дакладнасць заяў адказчыка будзе ацэньвацца ў істотна змененых умовах.

> *"Слуханне справы адказчыка ў судзе першай інстанцыі было сапсавана. Я чула вельмі шмат памылак у перакладзе. Я спадзяюся, што апеляцыйны суд надасць адказчыку і яго заявам увагу, якой яны заслугоўваюць",* — сказала **Алена Захаранка**, дачка аднаго са зніклых і пазоўніца ў гэтай справе.



## Былога сахраўца Юрыя Гараўскага апраўдалі паводле справы аб знікненні апазіцыйных палітыкаў

Пракурор запытваў для яго тры гады пазбаўлення волі, але суд вырашыў яго апраўдаць.

Першапачатковы пазоў быў пададзены вясной 2021 года двума сваякамі ахвяр пры падтрымцы TRIAL International, Міжнароднай федэрацыі за правы чалавека (FIDH) і Праваабарончага цэнтра "Вясна". За два гады да гэтага, пражываючы ў Швейцарыі, Юрый Гараўскі прызнаўся журналістам, што ў 1999 годзе ён быў датычны да трох знікненняў, і паведаміў іх падрабязнасці. 2 траўня 2022 года Юрыю Гараўскаму былі выстаўленыя абвінавачванні ў гвалтоўных знікненнях: **Юрыя Захаранкі**, былога міністра ўнутраных спраў; **Віктара Ганчара**, былога намесніка прэм'ер-міністра, і **Анатоля Красоўскага**, бізнесоўца і блізкага сябра Ганчара. Судовы працэс над Гараўскім адбыўся ў акруговым судзе Роршаха (кантон Санкт-Гален, Швейцарыя) 19-20 верасня 2023 года.

## Выкрыццё злачынстваў дыктатуры, учыненых 30-гадоў таму

Нягледзячы на апраўдальны прысуд, вынесены яму судом першай інстанцыі, гэтую справу можна лічыць прарыўной: суд прызнаў, што трое мужчын былі выкрадзеныя і забітыя і што да гэтых злачынстваў былі датычныя прадстаўнікі беларускіх уладаў. Акрамя таго, гэта быў першы выпадак, калі злачынства гвалтоўнага знікнення разглядалася ў швейцарскім судзе, і першы выпадак, калі суд вынес рашэнне па злачынствах, учыненых у Беларусі, на аснове прынцыпу універсальнай юрысдыкцыі.

> *"Я спадзяюся, што гэтая справа можа стаць добрым прыкладам у міжнароднай юрыдычнай практыцы. На жаль, з'ява гвалтоўных знікненняў шырока распаўсюджаная, і кожны чалавек, які страціў блізкага ў выніку гэтага злачынства, спадзяецца на справядлівасць",* — заявіла **Валерыя Красоўская**, дачка аднаго са зніклых і пазоўніца у справе.

Таксама працэс пракаментаваў **Алесь Бяляцкі**, заснавальнік і старшыня "Вясны":

> *"Неабходна павышаць дасведчанасць аб маштабах і сапраўднай прыродзе злачынстваў рэжыму Лукашэнкі. Гэтая справа — першая магчымасць за больш чым трыццаць гадоў дыктатуры дамагчыся таго, каб некаторыя з самых цяжкіх злачынстваў рэжыму былі нарэшце прызнаныя судом".*

Опубликовать

## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

**Заява аб прызнанні шасці чалавек палітычнымі зняволенымі**

**"Свет павінен спыніць рэкі крыві", — Нобелеўскі лаўрэат Алесь Бяляцкі выказаўся з нагоды пратэстаў у Іране**